# СОЦИОГУМАНИТАРНЫЕ И ПРАВОВЫЕ ПРОБЛЕМЫ ЦИВИЛИЗАЦИОННОЙ МОДЕРНИЗАЦИИ БЕЛОРУССКОГО ОБЩЕСТВА: ИСТОРИЧЕСКОЕ НАСЛЕДИЕ И СОВРЕМЕННОСТЬ

УДК 09

## ТРАДЫЦЫЯ «ПРЫКЛАДАННЯ КАМЕНЯ» Ў ДАСТО́ЕЎСКІМ І МО́ТАЛЬСКІМ МІКРАРЭГІЁНАХ ЯК ЭЛЕМЕНТ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

***В.В. Астапчук,*** *9 клас*
*Навуковы кіраўнік –* ***Ф.І. Рацык,*** *настаўнік*
***ДУА “Дастоеўская сярэдняя школа імя Ф. М. Дастаеўскага” Іванаўскага раёна***

**Уводзіны.** Беларускіх даследчыкаў заўсёды цікавіла традыцыя ўсталявання крыжоў. Закладваўся ў даследаванні з большага рэлігійны змест такой практыкі [1]. Аднак сутнасць народнага пачатку, светаўспрымання традыцыі, захавання яе будучымі пакаленнямі набывае ў наш час асаблівую актуальнасць. Цікаўнасць да могілак можа быць абумоўлена не толькі высокамастацкімі вартасцямі надмагілляў або вядомасцю пахаваных. На некаторых могілках праводзіцца працэдура інвентарызацыі. Невялікая частка з іх толькі апісваецца, некаторыя паступова добраўпарадкоўваюцца, але ўсё гэта толькі малая частка з аб’ёму, які патрабуе вывучэння і асэнсавання. Зварот да гісторыка-культурнай спадчыны сваёй мясцовасці дае выключнае значэнне для пошуку новых шляхоў сацыяльна-эканамічнага развіцця, абуджэння цікаўнасці да свайго гістарычнага мінулага. У артыкуле разглядаецца традыцыя “прыкладання каменя” на тэрыторыі Мотальскага і Дастоеўскага мікрарэгіёна, мясцовыя асаблівасці традыцыі і сучасны стан.

**Змест.** 21 лістапада праваслаўныя вернікі адзначаюць памяць Архістраціга Міхаіла (галоўнага над усімі анёльскімі чынамі). Напярэдадні гэтага свята звычайна на Дзяды ўспамінаюць памерлых продкаў[2]. Лічылася, што на восеньскія Дзяды продкі выходзяць з Выраю і спускаюцца на Зямлю, каб адведаць сваіх нашчадкаў-даведацца, ці правільна яны жывуць, ці славяць родных багоў, ці памятаюць продкаў. І свята павінна было праводзіцца менавіта так, каб продкі ўбачылі — памятаюць, славяць, правільна жывуць.

Да нашага часу ў мястэчку Моталь Іванаўскага раёна падчас святкавання Міхайлаўскіх Дзядоў захавалася ўнікальная традыцыя «Прыкладанне камэня» [3]. Гэтую даўнюю традыцыю можна ўбачыць, калі прыехаць у Моталь ў бліжэйшую суботу перад праваслаўным святам Міхала Арханёла (21 лістапада). У 2022 годзе Міхайлаўскія Дзяды будуць адзначацца 19 лістапада.

Падрыхтоўка да святкавання ў розных сем’ях адбываецца па-рознаму. Яна адрозніваецца ў залежнасці ад таго ці быў у перыяд з мінулагодніх Дзядоў і да цяперашніх нехта памерлы з родзічаў. Калі нехта паміраў і з дня пахавання не прайшло 40 дзён на момант Міхайлаўскіх дзядоў, тады трэба загадзя знайсці прыгожы палявы камень і з дапамогай спецыяльнага інструмента высекчы крыж і Галгофу (звычайна квадратнай ці паўавальнай формы). Даўней гэты працэс выконваўся ўручную зубілам і малатком, цяпер больш сучаснымі інструментамі. Звычайна гэтым займаюцца і адказваюць мужчыны. Жанчыны, ў сваю чаргу, ў пятніцу вечарам напярэдні Міхайлаўскіх Дзядоў, у доме дзе жыў памерлы родзіч, рыхтуюць посную вячэру.

Раніцай усе ішлі на памінальную службу ў царкву. З сабой трэба абавязкова браць падрыхтаваны камень. У царкве камяні выкладваюць на падлогу, папярэдне пасцяліўшы сурвэтку, наступным чынам: з левага боку кладуць камяні, прыгатаваныя для нябожчыкаў-жанчын, а з правага - для нябожчыкаў-мужчын. Менавіта такая раскладка дазваляе палічыць ўсім прысутным колькі чалавек якога полу памерла за гэты перыяд, так ў 2021 годзе ў царкве асвячалася каля 60 камянёў. Асвячоныя камяні потым нясуць на могілкі і прыкладваюць за крыжам, у галаве. Менавіта таму гэты абрад атрымаў назву «Прыкладанне каменя». Менавіта актыўнасць прыхаджан і выкананне абрадавых дзеянняў у Мотальскай царкве дазваляе існаваць традыцыі. Даследуючы надпісы на камянях і іх храналагічныя рамкі, прыходзіць разуменне залежнасці існавання традыцыі ад жыцця прыхода, царквы і запатрабаванасці супольнасці.

Даследаванні ў Дастоеўскім мікрарэгіене праводзіліся ў 2021-2022 годзе. Апытанне інфарматара, жыхара вёскі Застружжа Ясютчыка Івана Паўлавіча, дазволіла нам высветліць, што нематэрыяльная праява традыцыі ў выглядзе асвячэння камянёў у царкве знікла і не узнаўлялася, а вось матэрыяльная, менавіта камяні з надпісамі - існавала на мясцовых могілках даволі працяглы час, што дало нам падставы для больш поўнага даследавання могілак Дастоеўскага прыхода. Цэнтрам прыхода была Ільінская царква, якая была пабудавана ў 1788 годзе, але згарэла ад маланкі. Ільінская царква пасля грунтоўнага абследавання спецыялістамі Акадэміі Навук БССР у 1972, якія абаснавалі гісторыка-культурную каштоўнасць будынка і абразоў мясцовага пісання, па недарэчнасці ці спецыяльна, была знішчанана. Могілак у дастоеўскім прыходзе, якія ўдалося абследаваць, налічваецца шэсць: двое ў Дастоеве, двое ў Застружжы, Вулька, Кацкі, Аброва. У самім Дастоеве двое могілак: адныя старыя "Казацкія", другія новыя дзе адбываюцца пахаванні.

Найбольшую цікавасць выклікаюць знойдзеныя на некаторых пахаваннях бетонныя пліты ў выглядзе пяціграннікa, памерамі 40-60 сантыметраў, выраблены з дапамогай заліўкі ў форме, нанесенымі па незмацаваным растворы гадамі жыцця памерлага, ініцыяламі альбо поўным іменем і прозвішчам. Паводле аналізу надпісаў на камянях, было высветлена, што такое рашэнне бытавала ў гэтай мясцовасці ў перыяд 1930я – 1970я гады. Апошняе датаванае пахаванне з такім бетонным каменем фіксуецца 1978 годам. Пахаванне з усталяваным чорным гранітным помнікам, на дзве асобы, апошняе з якіх датуецца 2013 годам, але камень прыкладзены толькі ў галовах памерлага мужчыны, які быў пахаваны ў 1978. Агульны выгляд пахаванняў з такімі плітамі, дае падставу зрабіць вывад аб тым, што родзічы памерлага, якія даглядалі магілу, разумелі аб нядоўгім перыядзе жыцця драўлянага надмагільнага крыжа, ставяць гранітныя альбо мрамарныя помнікі і аддаючы даніну традыцыі і памяці продкаў астаўляюць камень.

Усходняя частка Застружскіх могілак засялялася ў больш позні час, ключавым месцам з'яўляецца пахаванне растраляных жыхароў Застружжа ў 1942 годзе, абазначанае камянямі. Пахаванне было добраўпарадкаванае да юбілея Перамогі ў 2020 годзе.

Правеўшы серыю экспедыцый і прааналізаваўшы найбольш захаваныя пахаванні, якія змяшчаюць пры сабе надмагільныя камяні, ўдалося зрабіць наступную выснову.

Традыцыя "Прыкладання каменя" ў Дастоеўскім мікрарэгіене мае старажытнае паходжанне і існавала да 1980-х гадоў. Прычыны знікнення традыцыі раскрываюцца ў наступных фактарах:

1. Знікненне традыцыі супадае з актыўнымі дэмаграфічнымі працэсамі на вёсцы, што прывяло да неперайманні традыцыі падрастаючымі пакаленнямі.

2. Знішчэнне мясцовымі актывістамі Ільінскай царквы, як асноўнага цэнтра захавання традыцыі.

3. Пасля знішчэнння царквы традыцыя трымалася толькі на носьбітах і знікла разам з імі.

**Заключэнне.** Традыцыя "Прыкладання каменя" ў Дастоеўскім і Мотальскім гісторыка-этнаграфічных мікрарэгіёнах у гістарычным аспекце развіцця прайшла некалькі этапаў. Традыцыя дагэтуль (напачатку XXI стагоддзя) поўнасцю захоўваецца толькі ў Моталі, а вось у Дастоеве і навакольных вёсках не захавалася (знікла напрыканцы XX стагоддзя) з многіх прычын.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Наша вера № 2(5)/1998 [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://media.catholic.by/nv/n5/art15.html. – Дата доступу : 01.02.2022.

2. Камень як сімвал родавай памяці беларусаў [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://zviazda.by/be/news/20170217/1487346163-kamen-yak-simval-rodavay-pamyaci-belarusau. – Дата доступу : 01.02.2022.

3. До нашего времени в Мотоле сохранилась уникальная традиция «Прыкладанне камэня» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://vk.com/wall418430001_190. – Дата доступу : 01.02.2022.